**Ўстанова адукацыі**

**“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

**Загадчык кафедры культуралогіі**

**_____________А.І. Смолік**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА–МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

па дысцыпліне

# “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ ДУМКІ”

**Складальнік: праф. Смолік А.І.**

**Вучэбна-метадычны комплекс зацверджаны на пасяджэнні кафедры культуралогіі 25.09.2012 года, пр. №1**

**2012**

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Беларуская культуралогія як навука аб культуры ў першым дзесяцігоддзі XXI ст. дасягнула сталага ўзроўню развіцця і ўжо набыла пэўную сістэмнасць, якая дазваляе прэтэндаваць на асэнсаванне шэрагу праблем , якія ў сумежных навуках да гэтага часу не атрымалі глыбокага асвятлення.

Элементы імпліцынтных культуралагічных ведаў можна выявіць ужо ў старажытных пісьмовых крыніцах. Мысліцелі мінулых эпох стваралі філасофію духа, фактычна распрацоўвалі тэматыку філасофіі культуры. У другой палове XIX ст. у галіне тэарэтычнага пазнання культуры адбылося станаўленне новага кірунку даследаванняў, які распаўся на мноства плыней. Антрапалогія, сацыяльная антрапалогія, культурная антрапалогія, этнаграфія, этналогія, пачынаюць інтэнсіўныя скрупулёзныя і прадуктыўныя пошукі вытокаў культурнай самабытнасці чалавека. Ідзе працэс фарміравання нацыянальных, у тым ліку і беларускай этнаграфічных школ. Беларускімі антраполагамі, архелагамі, этнографамі, фалькларыстамі быў сабраны вялізарны фактычны матэрыял, які дазваляў рабіць шырокія абагульненні ў сферы культуры. Але прадстаўнікі існаваўшых гуманітарных навук не маглі з пазіцый сваіх метадалагічных установак адказаць на шэраг пытанняў: У чым сутнасць культуры? Якая яе структура і функцыі? Якое ўздзеянне яна аказвае на чалавека? Якім чынам узнікае і існуе? і інш. Неабходна была новая гуманітарная дысыпліна з іншай метадалогіяй і методыкай даследчых працэдур. У 90-х гг. XX ст. у Беларусі адбылося станаўленне міждысціплінарнай галіны пазнання тэорыі культуры – айчыннай культуралогіі.

Мэтай вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя беларускай культуралагічна думкі ” з’яўляецца выяўленне культуралагічнага дыскурсу ў беларускіх літаратурных тэкстах, на падставе якога адбывалася станаўленне і развіццё айчыннай культуралогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падчас выкладання дадзенай вучэбнай дысцыпліны вырашаюцца наступныя задачы:

– абгрунтаванне тэзіса аб існаванні ў Рэспубліцы Беларусь самастойнай паўнавартаснай навукі аб культуры;

– раскрыццё разнастайнасці трактовак цэнтральнага для культуралогіі паняцця “культура” на розных гістарычных этапах развіцця грамадскай думкі;

– выяўленне культуралагічных ідэй і канцэпцый, якія фарміраваліся ў працэсе рэфлексій прадстаўнікамі беларускіх грамадскіх навук;

– назапашванне студэнтамі тэарэтычных ведаў, неабходных для апісання культуралагічных інтэнцый у беларускай сацыягуманітарнай спадчыне.

У выніку засваення тэм вучэбнага курса студэнт павінен *ведаць:*

– змест і сутнасць навуковых падыходаў да тлумачэння таго, як і чаму адбывалася станаўленне і развіццё імпліцытных культуралагічных ведаў;

– асноўныя культуралагічныя канцэпцыі і парадыгмы, якія ўзніклі ў пэўны перыяд у беларускай гуманітарыстыцы;

– дэтэрмінанты фарміравання эксплiцытных культуралагічных ведаў;

– персаналіі айчыннай культуралогіі і іх унёсак у развіццё беларускай культуралагічнай думкі;

– накірункі сучасных культуралагічных даследаванняў.

*умець:*

– аналізаваць знешнія і ўнутраныя фактары станаўлення і развіцця беларускай культуралагічнай думкі;

– выяўляць культуралагічны дыскурс ў разнастайнай сацыягуманітарнай спадчыне ;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вызначаць культуралагічную сутнасць, змест і сэнс розных літаратурных тэкстаў

– даследаваць асноўныя тэарэтыка-метадалагічныя працы беларускіх культуролагаў;

- выкарыстоўваць метадалогію айчынных культуролагаў у сваёй навукова-даследчай дзейнасці.

*Метады (тэхналогіі) навучання:*

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;
– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады);
– метад аналізу канкрэтных сітуацый;
– гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях, і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання сучаснай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі выпускніка ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінары |
| Уводзіны. | 2 | 2 | |
| **Тэма 1.** Духоўны патэнцыял старажытнабеларускай літаратуры | 5 | 3 | 2 |
| **Тэма 2.** Рэнесансна-гуманістычныя ідэі мысліцелеляў эпохі Адраджэння | 7 | 3 | 4 |
| **Тэма 3.** Культурасофія прадстаўнікоў Асветніцтва | 7 | 3 | 4 |
| **Тэма 4.** Фарміраванне эксплiцытных культуралагічных ведаў у Х1Х ст. | 7 | 3 | 4 |
| **Тэма 5.** Выяўленне адметнасці духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў у 2-й палове Х1Х-пачатку ХХ ст. | 8 | 4 | 4 |
| **Тэма 6.** Развіццё айчыннай культуралагічнай думкі ідыёлагамі нацыянальна-культурнага адраджэння | 8 | 4 | 4 |
| **Тэма 7.** Культуралагічны дыскурс у творчай спадчыне Якуба Коласа і Янкі Купалы | 7 | 4 | 3 |
| **Тэма 8.** Культуралогія – аснова гуманітарнага пазнання ў ХХ ст. | 7 | 4 | 3 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Тэма 9**. Сучасная беларуская культуралогія: стан, перспектывы, праблемы | 8 | 4 | 4 |
| Разам… | 52 | 28 | 24 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Значэнне дысцыпліны "Гісторыя беларускай культуралагічнай думкі" ў падрыхтоўцы культуралагічных кадраў. Прадмет, змест, мэта і задачы, структура вучэбнага курса. Міжпрадметныя сувязі дадзенай дысцыпліны. Віды вучэбных заняткаў. Крыніцы інфармацыі па праблематыцы вучэбнай дысцыпліны. Формы кантролю. Характарыстыка асноўных катэгорый айчыннай культуралогіі як навукі аб культуры. Беларуская культура як сукупнасць матэрыяльных, духоўных і сацыяльных каштоўнасцей. Паняцці "імпліцытныя" і "эксплiцытныя" культуралагічныя веды. Дыскурсіўны аналіз і яго сутнасць.

### *Тэма 1.* Духоўны патэнцыял старажытнабеларускай літаратуры

Каштоўнасныя ўстаноўкі маральнага выхавання асобы ў творах старажытнабеларускіх мысліцяляў. Асновы этыкетнай культуры Еўфрасінні Полацкай. Выяўленне фактараў маральнага удасканалення асобы Кірылам Тураўскім, Кліментам Смаляцічам і Аўраміям Смаленскім: свабодны выбар чалавека, саборнасць, самавыхаванне, актыўнасць чалавека.

Рэлігія як носьбіт ідэалаў выхавання і адукацыі. Важнейшыя палажэнні хрысціянскай этычнай дактрыны. Супрацьстаянне дабра і зла, дабрадзейнасці і граха. Хрысціянскі гуманізм асветнікаў Сярэднявечча. Сафілагічнае разуменне свету. "Прытча аб чалавечай душы і целе" Кірылы Тураўскага як праграма маральнага выхавання чалавека.

### *Тэма 2.* Рэнесансна-гуманістычныя ідэі мысліцелеляў эпохі Адраджэння

Увасабленне ідэі дыялагічнага характара беларускай культуры ў прадмовах Ф. Скарыны. Разуменне Ф. Скарынай патрыятызма і мовы як фундаментальных каштоўнасцей этнічнай культуры.

Наватарскія ідэі Сымона Буднага аб узаемадносінах грамадзян і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржавы (“Аб свецкай уладзе”). Адлюстраванне каштоўнасцей дэмакратыі і свабоды ў працах С. Буднага. Крытычныя адносіны С. Буднага да тэалагічнага трансцэндэнталізма, пропаведзь чалавекабожжа (Аб апраўданні грэшнага чалавека перад Богам”).

Увасабленне карціны свету беларусаў, сімвала радзімы у творах М. Гусоўскага. Ідэя М. Гусоўскага ад сувязі маральных каштоўнасцей чалавека з прыродным асяроддзем (паэмы “Песня пра зубра”, “Новая і слаўная перамога над туркамі ў ліпені месяцы”, “Жыццё і ўчынкі святога Гіацынта”).

Распрацоўка пытанняў сацыялізацыі Лаўрэнціям Зізаніям (“Грамматіка словенска съвершенного искусства осьми частій слова…”) Васілём Цяпінскім, Мялеціям Сматрыцкім (“Грамматики славенския правильное синтагма”). Канцэпцыя свабоды Андрэя Волана (“Пра палітычную або грамадзянскую свабоду”). Рэфармацыйна-гуманістычны пафас твораў Міхаіла Літвіна (“Аб норавах татараў, літоўцаў і масквіцян”). Этнаграфічная спадчына Саламона Рысінскага.

### *Тэма 3.* Культурасофія прадстаўнікоў Асветніцтва

Фарміраванне імпліцытных культуралагічных ведаў уфіласофіі, гісторыі, літаратуры і мастацтве. Абгрунтаванне ідэі навуковага гістарызму ў творах , К. Вырвіча (“Паходжанне сучасных дзяржаў і народаў”), І. Капіевіча, Ф. Папроцкага, А. Нарушэвіча. Лука Залускі аб прыярытэце навукі пра чалавека і гуманістычным ідэале навукі (“Агульная філасофія”, “Практычная філасофія”, “Тэарэтычная філасофія”). Тэарэтычныя асновы этыкі Язэпа Даманеўскага (“Жыццё сельскае і гарадское”, “Некаторыя эмблемы”). Лагічныя, метафізічныя і натуралістычныя аксіёмы розуму ў працах Андрэя Вішаватага (“ Аб рэлігіі, згоднай з розумам”). Адлюстраванне рэнесансавых і асветніцкіх ідэалаў у трактаце Казіміра Лышчынскага “Аб неіснаванні Бога”.

Гомацэнтрычны светапогляд Сімяона Полацкага (казанне “Слова ў дзень Новага лета”). Інтэрпрэтацыя хрысціянскіх духоўных каштоўнасцей С. Полацкім. Экуменістычныя погляды С. Полацкага. Трактоўка хрысціянскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сімволікі ў працах С. Полацкага (“Абед душэўны”, “Вячэра душэўная”). Уклад С. Полацкага ў фарміраванне самабытнага ўсходняга тыпу барочнай культуры. Рэлігійна-хрысціянская эстэтычная канцэпцыя прыгожага і мастацтва С. Полацкага (“Слова да шчырага іконнага пісання”).

***Тэма 4.* Фарміраванне экспліцытных культуралагічных ведаў у XIX ст**.

Перадумовы складвання экспліцытных ведаў аб культуры. Змена арыенціраў пазнання: эмпірызм і рацыяналізм як аснова пазнання; маральная вера як апора маральнасці; рэабілітацыя разума І. Кантам; новая трактоўка культуры Ф. Гумбальдтам; этнаграфічнае паняцце культуры; лінейна-прагрэсіўная парадыгма культуры; рамантычна-паэтычная ўспрыняцця жыцця і інш. Ажыўленне навуковага і грамадска-палітычнага жыцця ў Беларусі ў першай палове Х1Х ст.: адкрыццё Полацкай іезуіцкай акадэміі, Віленскага універсітэта; тайныя таварыствы; вывучэнне вуснай народнай творчасці.

Увасабленне аб’ектаў беларускай народнай культуры ў творчасці Адама Міцкевіча (“Дзяды”, “Пан Тадэуш”, “Гражынна” і інш.). Мастацкі вобраз суб’екта беларускай культуры ў творах А. Міцкевіча, Я. Чачота “Мышанка”, “Навагрудскі замак”, “Свіцязь-возера”). Адлюстраванне фальклору, абрадаў і звычая’ў беларусаў у паэмах і баладах Томаша Зана (“Табакерка”, “Цыганка”, “Твардоўскі”). Глыбокі гуманізм, патрыятызм і свабода як фундаментальныя каштоўнасці беларускай культуры (паводле Кастуся Каліноскага). Абгрунтаванне ідэі талерантнасці Францам Савічам (“Прынцыпы дэмакратызму”, “Успаміны”). Канцэпцыя і паслядоўнага і паступовага развіцця цывілізацыі Мацвея Лавіцкага (“Погляд на хрысціянскі свет”, “Варыяцыі”).

Вінцэнт Дунін-Марцынкевіч – прадстаўнік культурна-асветніцкай плыні ў грамадскай думцы Беларусі. Імкненне да ўстанаўлення гарманічных узаемасувязей у галіне культуры, маралі, нацыянальнага жыцця. Прынцып

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гарманічнага адзінства ў сферы маралі. Маральны характар ідэалу. Увасабленне аб’ектаў культуры штодзённасці ў творах В. Дуніна-Марцынкевіча (“Залёты”, “Пінская шляхта” і інш.). Культурна-асветніцкая праграма В. Дуніна-Марцынкевіча.

Сацыяльна-філасофскі і антрапалагічна абумоўлены тып суб’екта беларускай культуры ўвасоблены ў творах Янкі Лучыны. Выяўленне Я. Лучнай нацыянальнай ідэі (нацыянальны светапогляд). Дэмакратычная і патрыятычная накіраванасць маральна-эстэтычнай пазіцыі Я. Лучыны (“Вязанка”).

Гісторыка-філасофскае і мастацкае асэнсаванне этнагенэзу і культурагенэзу беларусаў Францішкам Багушэвічам (“Дудка беларуская”, “Смык беларускі”). Дэмакратычны характар эсэтыкі Ф. Багушэвіча. Народная культура як прадмет мастацкага адлюстравання ў творах Ф. Багушэвіча. Ідэя народнай свабоды і сцвярджэння права беларускага народа на сваю мову і духоўнае развіццё.

***Тэма 5*. Выяўленне адметнасці духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў у 2-й палове XIX- пачатку XX ст.**

Комплекснае параўнальна-гістарычнае даследванне гісторыі беларускай мовы і літаратуры, дыялекталогіі, фальклора беларусаў Я.Ф. Карскім (“Беларусы”,тт. 1-3). Тэарэтычныя высновы даследванняў Я.Ф. Карскага: абгрунтаваў нацыянальную самабытнасць беларусаў як самастойнага славянскага народа; паказаў багатую і арыгінальную культуру, старажытныя традыцыі беларусаў; вызначыў паходжанне беларускага народа , час фаміравання беларускай народнасці; акрэсліў этнічныя межы беларускага этнаса; ахарактарызаваў культурны стан плямён, якія склалі аснову беларускай народнасці, асвятліў этапы гісторыі беларускай мовы, яе спецыфічныя асаблівасці.

Адлюстраванне гістаграфічнай і этнаграфічнай асаблівасці суб’ектаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай культуры ў працах П.В, Бабpоўскага (“Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Расіі, сабраныя афіцэрамі Генеральнага штаба Гродзенскай губерніі”), А.Я Багдановіча (“Этнічны склад народаў славянскіх і рускіх”), А.Г. К. Кіркора (“Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню”, “Беларускае Палессе”, “Літоўскае Палессе”), К.П. Тышкевіча (“Вілія і яе бераг”), Я.П,. Тышкевіча (“Апісанне Барысаўскага павета: статыстычнае, гаспадарчае, прамыслова-гандлёвае”), М.Я. Нікіфароўскага (“Этнаграфічныя звесткі”) і інш. Фальклорна-этнаграфічныя даследаванні П.А. Бяссонава (“Беларускія песні”), У.М. Дабравольскага (“Прыказка і загадка”), І.І. Насовіча (“Легенды, паданні, быліны, байкі, анекдоты”), А.К. Сержпутоўскага (“Прымхі і забабоны беларусаў-паляшукоў”), М. Федароўскага (“Люд беларускі”), П.М. Шпілеўскага (“Беларускія народныя павер’і”), П.В. Шэйна (“Беларускія народныя песні”) і інш. Вынікі навуковых даследванняў: сфарміравалася айчынная фалькларыстыка як навука пра славесную народную творчасць беларускага народа; вызначаны спецыфічныя рысы вуснай народнай творчасці беларусаў, заканамернасці яе развіцця, жанравыя асаблівасці; высвятлена ўзаемасувязь фальклору і літаратуры, месца і роля народнай творчасці ў развіцці нацыянальнай культуры; адзначана спалучэнне калектыўнага і асабістага ў творчай дзейнасці майстроў фальклору.

***Тэма 6.*** **Развіццё айчыннай культуралагічнай думкі ідыёлагамі нацыянальна-культурнага адраджэння.**

Сацыкультурная канцэпцыя І.У. Канчэўскага (Абдзіраловіча) у філасофскім эсэ “Адвечным шляхам: Даследзіны беларускага светапогляду”: адметнасці культурагенэза беларусаў; дзяржаўная незалежнасць як агульначалавечы ідэал; беларуская сацыяльна-эканамічная ідэя;

Праблемы нацыянальна-культурнага адраджэння ў працах А.І. Цвікевіча: адметнасці фарміравання грамадска-палітычнай думкі на Беларусі; станаўленне самасвядомасці і развіцця дзяржаўнасці беларускага народа;

Сістэматызаваны комплексны аналіз гісторыі беларускай культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М.А. Багдановічам. Выяўленне і ўзбагачэнне паэтам багатых культурных традыцый беларускага народа (“Старая Беларусь”, “Старая спадчына”). Распрацоўка М.Багдановічам шэрагу метадалагічных і культурна-гістарычных пытанняў спадчыны беларусаў. Вызначэнне ролі праваслаўнай, каталіцкай і ўніяцкай царквы ў духоўным жыцці беларускага народа. Абгрутаванне М. Багдановічам ключавых паняццяў, стасаваных да нацыянальна-культурнага развіцця у працы “Беларускае адраджэнне”: “беларуская культура”, “беларускі народ”, “беларуская нацыя”, “беларуская мова”, “наццыянальная свядомасць” і інш. Канцэпцыя адкрытасці беларускай культуры на сусветную цывілізацыю. Выяўленне ўплыву на дынаміку беларускай культуры знешніх дэтэрмінантаў.

Тэарэтычнае абгрунтаванне грамадскага прызначэння беларускай культуры М.І. Гарэцкім (“Гісторыя беларускай літаратуры”). Акрэсленне праблем духоўнага сталення беларускай нацыі, глыбінных гісторыка-культурных патэнцый беларускага народа (“Развагі і думы”, “Наш тэатр”). Вызначэнне М. Гарэцкім звышзадачы беларускіх культурна-адраджэнчаскіх сіл. Культуратворчая дзейнасць М. Гарэцкага.

Роля Інстытута беларускай культуры ў станаўленні айчыннай культуралагічнай думкі (1922-1929 гг.). Навуковая дзейнасць Я.Ю. Лёсіка, С.М. Некрашэвіча, М.М. Шчакаціхіна і інш.

### *Тэма 7.* Культуралагічны дыскурс у творчай спадчыне Якуба Коласа і Янкі Купалы

Асэнсаванне першавытокаў беларускай культуры, спасціжэнне яе самабытнага характара, сутнасці этнанацыянальнага духу, месца і ролі інтэлегенцыі і сялянства як суб’ектаў культуры ў грамадскім працэсе Я. Купалам (“Вера і нацыянальнасць”, “Справа незалежнасці за мінулы год” і інш.). Асаблівае прадчуванне сутнасных працэсаў, феноменаў і з’яў беларускай культуры Я. Купалам (“Тутэйшыя”). Разуменне Я. Купалам беларускай мовы як асноўнага выніка і сродка культуры, матэрыялізаванага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

думання, выяўлення ступені развіцця нацыі (“Ці маем ма права выракацца роднай мовы”.

Выяўленне Я. Купалам сутнасці беларускага адраджэння як заканамернага эканамічнага, палітычнага і сацыякультурнаеа развіцця Беларусі (“Больш самачыннасці”, “Чаму плача песня”). Вызначэнне стратэгіі адраджэння Я. Коласам (“Вялікія грандыёзныя задачы”, “Ліст да маладнякоўцаў” ). Распрацоўка праблем культурнай памяці, этнакультурнай ідэнтыфікацыі, ментальнасці, нацыянальнай самасвядомасці, духоўных ідэалаў беларусаў Я. Коласа.

Інтэрпрэтацыя зместу, форм, сродкаў, метадаў інкультурацыі, ролі агентаў і сацыяльных інстытутаў інкультурацыі Я. Коласам (“Методыка роднай мовы”, “Другое чытанне для дзяцей беларусаў” і інш.). Беларуская мова як сродак фарміравання этнічнага светапогляду асобы, развіцця яе мыслення, эстэтычнчнага густу, крэатыўнасці (“ Шануйце і любіце сваю родную мову”).

Мастацкія і публіцыстычныя творы Я. Коласа і Я. Купалы як культуралагічная мадэль літаратурнага тэксту і феномен сацыяльных камунікацый і крыніц культуралагічнай інфармацыі. Увасабленне ў іх мастацкіх тэкстах каштоўнасцей, норм, значэнняў, ідэалаў, сімвалаў і сэнсаў, архетыпаў і артэфактаў этнанацыянальнай духоўнай і матэрыяльнай культуры. Асэнсаванне творцамі найбольш рэпрэзентатыўных аўтэнтычных духоўных і прадметных форм культуры беларускага народа.

## *Тэма 8*. Культуралогія – аснова гуманітарнага пазнання ў ХХ ст.

Паняцце “культура” як метакатэгорыя сучасных сацыяльна-гуманітарных навук. Вызначэнне ролі культуры ў фарміраванні і творчай самарэалізацыі асобы.

Даследаванне глыбінных працэсаў пераемнасці, змен, узбагачэння духоўных асноў беларускага грамадства супрацоўнікамі акадэмічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інстытутаў.

Сістэмнае вывучэнне культуры першабытнага грамадства навукоўцамі Інстытута гісторыі АН БССР (У.Дз. Будзько, А.Г. Калечыц, А.Р. Мітрафанаў, К.М. Палікарповіч, Л.Д. Побаль і інш.).

Распрацоўка актуальных праблем тэорыі і гісторыі мастацкай культуры ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ( В.К. Бандарчык, Л.Н. Дробаў, З.Я. Мажэйка, М.С. Кацар, А.С. Фядосік, М.М. Яніцкая і інш.).

Выяўленне заканамернасцей сацыякультурнага развіцця беларускімі філосафамі (Я.М. Бабосаў, А.С. Майхровіч, С.А. Падокшын і інш.).

Інтэрпрэтацыя літаратурных тэкстаў як культурнай прасторы беларускімі літаратуразнаўцамі (У.В.Гніламёдаў, В.П. Жураўлёў, В.А. Каваленка, М.М. Мушынскі, М.А. Тычына, Т.І. Шамякіна і інш.).

Выяўленне ўзаемсувясі і ўзаемадзеяння беларускай мовы і культуры мовазнаўцамі ( А.І. Падлужны, М.Р. Суднік, Ф.М. Янкоўскі, М.С. Яўневіч і інш.). Станаўленне айчыннай сістэмы культуралагічнай адукацыі. Культуратворчая і навуковая дзейнасць навукоўцаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута і Мінскага інстытута культуры (Г.І. Барышаў, М.М. Грынчык, Р.Б. Смольскі, Ю.М. Чурко, В.Л. Яканюк і інш.).

***Тэма 9.*** **Сучасная беларуская культуралогія: стан, перспектывы, праблемы**

Неабходнасць сістэматызацыі і абагульнення фактычнага матэрыяла аб культуры, назапашанага сацыяльна-гуманітарнымі навукамі, як фактар дальнейшага развіцця айчыннай культуралогіі. Выпрацоўка ўласных культуралагічных метадалагічных прынцыпаў і ўстановак беларускімі навукоўцамі (У.М. Конан, М.І. Крукоўскі, М.А. Мажэйка, В.Ул. Пазнякоў, У.Д.Розенфельд, А.І. Смолік, Я.С. Яскевіч і інш.). Арганізацыя ведаў аб артэфактах у цэласную сістэму (С.Ул. Данскіх, І.В. Марозаў, У.П. Скараходаў, Ю.В. Чарняўская і інш.). Даследаванне дынамікі і базавых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кампанентаў каштоўнасных арыентацый суб’ектаў культуры ва ўмовах трасфармацыі сацыякультурнага асяроддзя (І.М. Варановіч, В.Л. Гуцько, Л.К. Кухто, Л.М. Мажэйка, А.Э. Салікаў, С.З. Семярнік, А.А. Спірына і інш.). Выяўленне ролі і месца ў структуры культурнага арганізма этыкі і рэлігіі, іх узаемаадносін як сэнсаўтваральнага прынцыпа ліка і стыля культуры (І.Ул. Вараб’ева, І.М. Каган, Э.А. Мазько, А.А. Суша, І.І. Траццяк і інш.). Аналіз аксіялагічных і стуктурных асноў мастацкай культуры (Л.С. Кажухоўская, У.Ф. Мартынаў, Э.А. Усоўская, А.А. Чучвага, І.М. Шумская і інш.).

Афармленне навуковых цэнтраў па даследванню праблем тэорыі і гісторыі культуры: БДУ, БДУ культуры і мастацтваў, Беларускі інстытут праблем культуры, Гродзенскі ўніверсітэт імя Я. Купалы, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы.

Фарміраванне і развіццё вышэйшай культуралагічнай адукацыі ў Беларусі. Паслядыпломная культуралагічная адукацыя і яе формы: магістратура, аспірантура, дактарантура.

Манаграфічная і вучэбна-метадычная літаратура, аўтарамі якой з’яўляюцца беларускія культуролагі.

Перыядычныя выданні па праблемах тэорыі і гісторыі культуры: часопісы, зборнікі навуковых матэрыялаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. История культурологии / под ред. А.П. Огурцова. – М.: Гардарики , 2006. – 383 с.
2. *Конан, В.М.* Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в. / В.М. Конан. – Мн.: , 1985. – 198 с.
3. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. дведнік / Беларус. Энцыкл.; Гал. рэд. "Беларус. Энцыкл."; Б.І. Сачанка (гап. рэд.) і інш. Маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 1995. – 671 с.: іл.
4. *Падокшын, С.А*. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / С.А. Падокшын; навук. рэд. А.С. Майхровіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 283 с.
5. *Смолік, А.І.* Культура Беларусі XI-XIX стст.: Навуковы даведнік. / А.І. Смолік. – Мн.: Беларускі універсітэт культуры, 1998. – 182 с.
6. *Смолик, А.И.* Белорусская культурология как научная дисциплина: становление и развитие / А.И. Смолик // Искусство и культура. – 2011. – № 1. – С. 83-89.
7. *Смолік, А.І.* Сутнасць і сэнсы культуры / А. І. Смолік // Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І. Смолік, Л.К. Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – С. 7-26.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*


1. *Булахов, М.Г.* Евфимий Фёдорович Карский : жизнь, науч. и обществ. деятельность / М. Г. Булахов; под ред. В. И. Борковского. – Минск : Изд-во БГУ, 1981. – 271 с.
2. *Гниламёдаў, У.* Янка Купала: Новы погляд / У. Гніламёдаў. – Мінск: новая Асвета, 1995. – 174 с.
3. *Дасаева, Т.М.* Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага / Т.М. Дасаева. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 87 с.
4. *Кравкин, В.И.* Гносеология культуры (К постановке проблемы) / В.И. Кравкин // Искусство и культура . – 2011. – № 1. – С. 107-117.
5. *Лойка, А.* Максім Багдановіч / А. Лойка. –Мінск: , 1966. – 333 с.
6. *Мушынскі, М.* Якуб Колас: Летапіс жыцця і творчасці / М. Мушынскі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1982. – 543 с.
7. *Смолік, А.І.* Духоўная культура / А.І. Смолік // Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І. Смолік, Л.К. Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – С. 43-65.
8. *Янчук, Н А.* К. Киркор. Краткий очерк жизни и деятельности / Н. Янчук. – М.: 1888, 29 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Экзаменацыйныя пытанні на курсу

“Гісторыя беларускай культуралагічнай думкі”

1. Культурна-гістарычныя передумовы фарміравання беларускай культуралагічнай думкі.
2. Імпліцытныя і эксплiцытныя культуралагічныя веды і іх развіццё.
3. Вытокі і змест антычнай культуралагічнай думкі.
4. Рацыяналістычныя погляды мысліцеляў Сярэднявечча: гуманізм Е. Полацкай, К. Смаляціча, К. Тураўскага, А. Смаленскага і інш.
5. Рэнесансна- гуманістычныя погляды асветнікаў эпохі Адраджэння: Ф. Скарыны, С. Буднага, Л. Зізанія, В. Цяпінскага, М. Сматрыцкага.
6. Эстэтычныя праблемы мастацкай культуры ў духоўнай спадчыне С. Полацкага.
7. Гуманістычны ідэал навукі як формы культуры ў працах Л. Залускага.
8. Культурныя каштоўнасці і іх інтэрпрэтацыя Я. Даманеўскім.
9. Асветніцкія ідэалы Б. Дабашэвіча, К. Лышчынскага, К. Нарбута.
10. Духоўныя каштоўнасці беларускага народа- аснова рамантызму А. Міцкевіча, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага.
11. Першыя этнаграфічныя даследаванні матэрыяльнай культуры Беларусі: Я. і К. Тышкевічы, М. Доўнар-Запольскі, Я. Раманаў, Я. Карскі, І. Сербаў.
12. Фальклорна-этнаграфічнае вывучэнне на Беларусі ў 19-п. 20 ст.: П. Бяссонаў, А. Кіркор, М. Нікіфароўскі.
13. Гісторыка-этнаграфічныя даследаванні А. Каяловіча і А. Цвікевіча.
14. Пераасэнсаванне культурных каштоўнасцей І. Абдзіраловічам.
15. Форма як сродак функцыянавання беларускай культуры ў кантэксце філасофскага эссэ “Адвечным шляхам”.
16. Этнічная аперцэпцыя Я. Коласам з’яў беларускай культуры.
17. Парадыгма нацыянальнага культурнага Адраджэння ў творчасці Я. Купалы.
18. Культуралагічная інтэнцыя ў духоўнай спадчыне М. Багдановіча.
19. Культуралагічныя погляды М. Гарэцкага ў “Гісторыі беларускай літаратуры”.
20. Сучасная айчынная культуралогія: стан, перспектывы, праблемы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ